УДК 811.161. 3" 373:821. 161.3 – 31

# ФУНКЦЫІ ПАРЦЭЛЯВАНЫХ КАНСТРУКЦЫЙ У МОВЕ ТВОРАЎ І. НАВУМЕНКІ

**С.І. Жураўлёва**
(Мазыр, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны аналізу функцыянальных асаблівасцей парцэляваных канструкцый. На матэрыяле мастацкіх твораў І. Навуменкі апісваюцца выяўленчая, эмацыянальна-экспрэсіўная, характалагічная функцыі парцэлятаў.*

Парцэляваныя канструкцыі – гэта такое чляненне сказа, "пры якім змест выказвання рэалізуецца не ў адной, а ў дзвюх і больш інтанацыйна-сэнсавых канструкцыях, размешчаных адна за другой з працяглымі паўзамі" [1, 97]. У мове сучаснай беларускай мастацкай прозы яны шырока выкарыстоўваюцца для "экспрэсіўнага выдзялення той або іншай часткі выказвання" [2, 285]. Гэту функцыю парцэлятаў лінгвісты адносяць да асноўнай або пастаяннай: незалежна ад зместу яна ўласціва любому парцэляту. Разам з тым, парцэляты валодаюць і факультатыўнымі, або пераменнымі, функцыямі, якія залежаць ад сэнсу выказвання і адлюстроўваюць намеры аўтара. Да факультатыўных функцый належаць выяўленчая, характаралагічная, эмацыянальна-выдзяляльная і экспрэсіўна-граматычная [3, 87]. Парцэляваныя канструкцыі з названымі функцыямі нярэдка выкарыстоўвае ў мове сваіх твораў І. Навуменка.

Найбольш прадуктыўнай функцыяй парцэляваных канструкцый у мове твораў І. Навуменка з'яўляецца выяўленчая. Яна праяўляецца пры мастацка-вобразнай канкрэтызацыі падзей і з'яў.

Парцэляваныя канструкцыі называюць дзеянні, якія адбываюцца паслядоўна, адзін за другім, засяроджваючы ўвагу на кожным з іх. Тым самым ствараецца эфект запаволенага кадра: *–Хіба схаваеш. Абходчыка дапытвалі.* ***Цэлую ноч трымалі. Выпусцілі пад раніцу*** [4, ІІІ, 258].

З дапамогай парцэляваных канструкцый І. Навуменка вылучае:

а) найбольш важныя прыметы персанажа: *Па паходжанню немец.* ***Аднекуль з Прыбалтыкі. Але па выхаванню, па сваіх поглядах на жыццё – тыповы рускі. У бальшавікоў карыстаўся аўтарытэтам і, здаецца, не малым, добры, адменны спецыяліст. Служыў на лесаразпрацоўках*** [4,ІІІ, 267];

б) акцэнтуе ўвагу на найбольш істотных элементах яго паводзін: *Вырай – высокі, з худым, маршчыністым тварам, і хоць яму толькі сорак – зусім лысы.* ***Выкладае мову, прадмет ведае, але страшэнна крыклівы на сходах. Пагражае ўсімі карамі тым, хто ўцякае з лекцый і семінараў*** [4, ІІІ, 425]; *– Чалавек такі.* ***Нікае ўсюды, як сабака. Нюхае, віжуе*** [5, 17];

в) вылучае асобныя дэталі агульнай карціны, у адпаведнасці з кампазіцыйнай задумай: *– Чалавека трэба вывучаць яшчэ мільён гадоў, – даказвае Веньямін. – І за мільён не вывучыш.* ***Бо чалавек – цэлы сусвет…Такі ж велізарны, як космас… Практычна бясконцы…*** [4, Ш, 417].

У парцэляваных кантрукцыях робіцца вывад, які лагічна не выяўляецца ў папярэднім выказванні. Гэта стварае нечаканасць наступлення дзеяння і таму ўзмацняе экспрэсію: *– Гісторыя крывёй напісана, – напаўголаса, нібы сам з сабой, разважае Вадэйка. – З самых першых крокаў чалавека.* ***Але свет такога даўно не бачыў. Даўно… Можа, з часоў Чынгісхана*** [4, ІІІ, 325].

Парцэляваныя канструкцыі з выяўленчай функцыяй ствараюцца на аснове паралелізму, які ўзмацняе аўтарскую думку: *Так жыццё не вывучыш.* ***Трэба стаць да яго бліжэй, упрытык, як кажуць. Трэба вярнуць сваё добрае імя, народ яго ўсё-такі памятае…***[4, ІІ, 363].

Пры апісанні паводзін персанажаў, пры стварэнні псіхалагічнага партрэта парцэляваныя канструкцыі ўжываюцца для ўзмацнення мастацкага кантрасту: *Любяць курынае мяса.* ***Кураеды. Яйкаеды. Але не чапаюць*** [4, ІІІ, 319].

Выкарыстанне парцэляваных кантрукцый, якія выконваюць выяўленчую функцыю, дапамагае пісьменніку акцэнтаваць увагу на асобных дэталях, надаць мове большую выразнасць, экспрэсіўнасць.

У творчасці Івана Навуменкі парцэляты выкарыстоўваюцца не толькі з выяўленчай функцыяй, але і з характаралагічнай. Характаралагічная функцыя парцэлятаў праяўляецца ў імітацыі маўленчай манеры суб'екта.

Парцэляты ў мове твораў пісьменніка ўжываюцца як сродак выражэння далучальнай сувязі ў маналогах персанажаў.

Аўтар выкарыстоўвае парцэляты ў маналагічнай форме, напрыклад, выступленні:

*– Летась да нас таксама прыязджалі студэнты, – працягвае старшыня. –* ***З вашага інстытута. Некаторыя працавалі добра, нічога кепскага не скажу. Але была адна групка… І гаварыць брыдка. Думалі, што прыехалі на курорт, а не ў калгас. Вылежваліся, нас, калгаснікаў, зневажалі…*** [4, ІІІ, 394].

З мэтай выказаць, імітаваць працэс эмацыянальна-разважальнай дзейнасці чалавека І. Навуменка ўжывае парцэляваныя канструкцыі ў асобай разнавіднасці маналогу – унутраным маналогу:

*Коўба – жывё ліна, розуму не мае, што з яе возьмеш.* ***А вотчым жа Піліпкаў усё-такі чалавек. Але горш за звера*** [4, І, 485]; *Нявестка Паўлу падабаецца.* ***Маўклівая, мяккая, інтэлегентная*** [6, 222].

Парцэляты адлюстроўваюць разважанні, перажыванні герояў, іх псіхалагічны стан.

У мове твораў пісьменніка парцэляты з'яўляюцца сродкам выражэння далучальнай сувязі ў дыялогах і палілогах персанажаў:

*Знайшоў каго шкадаваць! Ды ён любога ў лыжцы вады ўтопіць.* ***Паразіт і п'яніца. Забойца*** [6, 213];

*– Расказвай цяпер ты.* ***Твая чарга,*** *– просіць Драгун.*

*– Што расказваць. Хапала ўсялякага. У дваццатым годзе я быў на польскім фронце.* ***Па мабілізацыі прафсаюзаў. Трапіў у самую кашу – пад Ваўкавыскам полк разбілі. Якраз восенню…*** [4,ІІІ, 128].

Парцэляваныя канструкцыі ў дыялогах і палілогах дапамагаюць стварыць аўтару яркія мастацкія вобразы, перадаць асаблівасці іх маўлення, паўней раскрыць светапогляд герояў, іх унутраны псіхалагічны стан.

Парцэляты ў творах І. Навуменкі – сродак унясення размоўнай інтанацыі далучэння ў мову апавядальніка:

МГПУ им. И.П.Шамякина

*Лось склаў на выгане ў акуратныя лаўжы і спаліў, а камлі перацяг у свій двор і пілаваў іх на дровы пілой-аднаручкай два тыдні. Скончыўшы работу, лѐг і памѐр.* ***Нібы прадчуваў смерць і што было моцы стараўся завяршыць справы на зямлі…*** [4, II, 388].

Выкарыстанне парцэлятаў у мове апавядальніка спрыяе раскрыццю аўтарскай пазіцыі, выяўленню адносін аўтара да герояў твораў.

Парцэляты ў творчасці Івана Навуменкі выступаюць адным са сродкаў стварэння кантэкстаў няўласна-простай мовы, спосабам уключэння ў аўтарскую мову элементаў маўленчай і псіхалагічнай сферы персанажа:

*Веньям ловіць сябе на зласлівым пачуцці да аспіранта.* ***Ходзіць як індык надзьмуты. Кантакту са студэнтамі няма, ды ѐн і не шукае кантакту. Стараецца ўсяляк падкрэсліць сваѐ становішча. А сам быў на выпіўцы ў медыкаў. Паказная сур'ѐзнасць*** [4, III, 426].

Парцэляваныя канструкцыі, якія пісьменнік выкарыстоўвае ў няўласна-простай мове, дапамагаюць зразумець перажыванні, думкі герояў.

Такім чынам, парцэляты з характаралагічнай функцыяй ужываюцца як сродкі выражэння далучальнай сувязі, стварэння мастацкіх вобразаў, іх псіхалагічнай характарыстыкі.

І. Навуменка нярэдка ўжывае ў мастацкіх творах парцэляты з эмацыянальна-выдзяляльнай функцыяй, якія служаць для выяўлення эмоцый, эмацыянальнага стану і эмацыянальнай ацэнкі. Узмацняючы эмацыянальны элемент, пісьменнік стварае парцэляты, якія выражаюць тое або іншае маральнае пачуццѐ :

1) **непрыемнасць**: – *У танцах такая звычайнасць.* ***Але мне непрыемна*** [4, II, 109];

2) **боязь**: – *Дзіўна, яна [Ванда] выходзіць на шпацыр толькі па вечарах.* ***Нібы баіцца людзей*** [4, II, 102];

3) **страх**: *На імгненне яе [Рыту] працяў страх – калі яна не прыйдзе хоць у дванаццаць, там, дома, здарыцца незвычайнае.* ***Але страх валодаў ѐю толькі імгненне*** [4, II, 465];

4) **злосць**: – *Ён [Кавалюк] таксама зацяўся.* ***Нават разглаваўся*** [4, III, 507].

З некалькіх пачуццяў пры дапамозе парцэляцыі пісьменнік выдзяляе адно з іх, найбольш уласцівае герою твора, напрыклад, **страх**: – *На душы ў Сашы прыкры асадак.* ***І як бы страх*** [4, III, 439].

Ужыванне парцэлятаў, якія супрацьпастаўляюцца базавай частцы, узмацняе, акцэнтуе ўвагу на пэўных эмоцыях, псіхалагічным стане героя: – *Стомленасці не адчувае.* ***Бо такая, як цяпер, работа прыносіць вялікае задавальненне*** [6, 311]; *Усѐ Петракова цела ные ад стомы.* ***Але гэта стома прыемная*** [6, 311]; *Яна [цѐтка Мальвіна] спакойна ўзяла вядро і выйшла.* ***Але сэрца з яе грудзей ледзь не выскаквала*** [4, 1, 224]; *Гэта было б прыгожа*. ***А так брыдка*** [4, III, 366].

У некаторых выпадках аўтар выкарыстоўвае парцэляты, якія самі выражаюць некалькі пачуццяў: – *Ён [Андрушкевіч] думае аб ѐй кожнай хвіліны, і гэтыя думкі, згадкі прыносяць ні з чым не параўнаную радасць, трапятанне сэрца.* ***Смутак і боль таксама*** [6, 72]; *Тамара Іосіфаўна наводзіць парадак на кухні, пераціраe падлогу. Шукае занятку рукам.* ***Бо на душы трывожна, неспакойна*** [6, 176]; – *А можа, прыходзяць ужо к Гомелю? – прамовіў Мікола Асмалоўскі.* ***Ад такіх здагадак было лѐгка і радасна*** [4, 1, 42]. Такія парцэляваныя канструкцыі дапамагаюць паўней раскрыць эмацыйны стан персанажаў твора.

Парцэляты ў творах І. Навуменкі выражаюць таксама ступень або меру праяўлення эмоцый: *Ні з адной з дзяўчат Міхась не пазнаѐміўся.* ***Быў залішне сціплы і сарамлівы*** [6, 235]; *Бачыў многа дубоў.* ***Вельмі іх любіў*** [4, III, 431].

Парцэляцыя як сродак узмацнення эмацыянальнасці выказвання часцей за ўсѐ адлюстроўваецца ў мове персанажаў. І гэта невыпадкова, бо ў творах аўтар імкнецца найбольш поўна і аб'ектыўна перадаць пачуцці, адносіны, унутраны стан герояў: – *А цяпер яму штодзень і не сорамна.* ***Нават весела*** [4, III, 199]; *Якуб Колас нарадзіўся і жыў у хаце лесніка. Бачыў многа дубоў. Вельмі іх любіў.* ***Бо калі зірнеш на дуб – радасна*** [4, III, 431].

Парцэляты з эмацыянальна-выдзяляльнай функцыяй сустракаюцца ў мове героя, ад імя якога вядзецца апавяданне: *Я апранаю чыстую адпрасаваную сарочку, завязваю новы гальштук, шмарую бархоткай туфлі.* ***Хвалююся*** [4, II, 81].

Радзей можна сустрэць парцэляты ў аўтарскай мове: *Цяпер Ліза як бы выказала сваю прыхільнасць да Васі.* ***Ад гэтага радасна*** [5, 94]. "Пачуцці, якія аўтар прыпісвае персанажу, успрымаюцца ў тэксце як аб'ектыўна існуючыя ў рэчаіснасці, – адзначае Л. Р. Бабенка, – а пачуцці, якія перажывае аўтар і выражае іх, маюць суб'ектыўную ацэнку" [7, 104].

У залежнасці ад аўтарскай задумы, сюжэта ў мове мастацкіх тэкстаў І. Навуменкі назіраецца розная колькасць парцэлятаў з эмацыянальна-выдзяляльнай функцыяй: у апавяданнях – 10, у аповесці «Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва» – 15. З іх дапамогай аўтар выдзяляе разнастайныя эмоцыі персанажаў, засяроджвае на іх увагу чытача, выражае ацэнку і спрыяе эмацыянальнай выразнасці тэксту.

Такім чынам, І. Навуменка ўмела выкарыстоўвае сінтаксічныя канструкцыі, якія выконваюць выяўленчую, характалагічную і эмацыянальна-экспрэсіўную функцыі.

**Літаратура**


1. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / пад рэд. акад. АН БССР М.В. Бірылы і докт. філал. навук, праф. П.У. Сцяцко. – Мінск: Выш. шк., 1990. – 222 с.
2. Иванчикова, Е.А. Парцелляция, еѐ коммуникативно-экспрессивные и синтаксичные функции // Морфология и синтаксис современного русского литературного языка.– М., 1968. – С. 249–286.
3. Сковородников, А.П. О функциях парцелляции в современном русском литературном языке / А.П. Сковородников // Русский язык в школе. – 1980. – № 5. – С. 86–91.
4. Навуменка, І. Збор твораў у шасці тамах / І. Навуменка. – Мінск: Маст. літ., 1981–1985. – Т. 2–3.
5. Навуменка, І. Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва: аповесці / І. Навуменка. – Мінск: Юнацтва, 1997. – 528 с.
6. Навуменка, І. Асеннія мелодыі: раман, апавяданні / І. Навуменка. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 318 с.
7. Бабенко, Л. Г. Лексические средства обозначения эмоций в русском языке / Л.Г. Бабенко. – Свердловск, 1989. – 120 с.


МГПУ им. И.П. Шамякина